Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
30 СНЕЖНЯ 2016 г. ПЯТНІЦА № 253 (28363)
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Чым уразіла тэлебачанне ў 2016-м?**
СТАР. 5



**Навагодняе свята – у бурштынавым пакоі**
СТАР. 3



**Праграма тэлебачання на тыдзень**
**20 КАНАЛАЎ**

# КРЫЛАТЫ ГАСПАДАР СВЯТА



Прыгажун певень па мянушцы Пеця ўжо каля двух гадоў жыве на падворку лепшай птушніцы Полацкага раёна Марыны КОСТЫК у вёсцы Азіна. Певень пароды брама важыць дзесяць кілаграмаў, мае спакойны, міралюбівы характар і грацыёзную постаць. Па гэтай прычыне любімца дзяцей выбралі гаспадаром-распарадчыкам года Вогненнага Пеўня ў раёне.

Фота БЕЛТА.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу:**

*«Не трэба даваць невыканальных абяцанняў і адмахвацца ад грамадзян, трэба проста брацца і практычна вырашаць пытанні, якія хвалююць насельніцтва. За апошнія гады спектр пытанняў, з якімі звяртаюцца на асабістых прыёмах грамадзяне, змяніўся. Час ідзе, і патрэбы людзей узрастаюць. Гадоў 10—15 таму наўрад ці ставіў бы хто-небудзь пытанне пра тое, што яму трэба ваду правесці ў дом. Гэта ўсё зразумела, людзі хочуць больш камфортна жыць. Але не трэба думаць, што ўсё можна за кошт дзяржавы рабіць. Трэба і самім прыкладаць намаганні і уносіць пасільны ўклад. Сумеснымі намаганнямі можна ўсё вырашыць».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 30.12.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9585 | ▲ |
| Еўра | 2,0450 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0324 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0720 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X
16253
9 771990 763008

## Працяг будзе

# ПОВЯЗЬ РОДУ

Пастаянныя шматгадовыя аўтары «Звязды» ў новай рубрыцы раскажуць аб тым, якія традыцыі і сімвалы нас аб'ядноўваюць і які сакральны сэнс яны маюць

## АД КУЛЬТУРЫ РОДУ ДА КУЛЬТУРЫ НАРОДА



Адмысловае ўпрыгажэнне для мотальскага каравая — «шышачкі».

**На працягу шэрагу гадоў старонкі газеты і яе мудрыя чытачы былі для нас своеасаблівым «круглым сталом», які дапамагаў прэзентаваць і адначасова асэнсоўваць традыцыі і святы беларусаў, іх шматвяковую этнакультурную спадчыну, тыя духоўныя каштоўнасці, якія дапамагалі народу і кожнаму чалавеку жыць у згодзе з нябёсамі, сваімі суседзямі, членамі сям'і, самім сабой. Наша спасціжэнне традыцыйных культурных практык мела некалькі этапаў.**
СТАР. 13

## Індыкатары якасці

# ЖЫЦЬ НЕ ПА ПАДРУЧНІКУ

### Што такое чытацкая кампетэнцыя, і чаму нашы дзеці ёй слаба валодаюць

**Наколькі хутка школа рэагуе на зменлівы свет? Ці запатрабаваныя веды, што даюцца на ўроках, у рэальным жыцці? Чаму і як вучыць дзяцей у школе? Як расстаўляць прыярытэты ў адукацыі? Адказы на гэтыя пытанні шукаюць ва ўсіх краінах свету, таму і спрабуюць уводзіць пэўныя індыкатары, параўноўваць дасягненні краін паміж сабой. Беларусь таксама імкнецца ацаніць сваю нацыянальную сістэму адукацыі па сусветных крытэрыях, менавіта таму ў 2018 годзе беларускія школьнікі ўпершыню возьмуць удзел у Міжнароднай праграме па ацэнцы адукацыйных дасягненняў вучняў (PISA).**




**Мы на фоне іншых**

Хоць у нас і дзейнічае нацыянальная сістэма маніторынгу якасці адукацыі, наша краіна да гэтага часу не прымала ўдзелу ў асноўных міжнародных сістэмах ацэнкі адукацыйных дасягненняў навучэнцаў.
СТАР. 4